# УЛАДЗІМІР АНТОНАВІЧ БАГІНА (ДА 90-ГОДДЗЯ З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ)



4 лістапада 2024 г. споўнілася б 90 гадоў з дня нараджэння лаўрэата Дзяржаўнай прэміі БССР былога загадчыка лабараторыі прагнозу нафтаноснасці Беларускага навукова-даследчага геолагаразведачнага інстытута кандыдата геолага-мінералагічных навук Уладзіміра Антонавіча Багіны.

У. А. Багіна (1934–2014) нарадзіўся ў в. Карнюткі Валожынскага раёна Мінскай вобласці. У 1958 г. пасля набыцця прафесіі геолага ў Беларускім дзяржаўным універсітэце быў накіраваны на працу ў г. Мазыр, у Беларускую кантору разведачнага свідравання «Белгалоўгеалогіі». Сваю працоўную дзейнасць пачаў у якасці калектара, затым працаваў старшым геолагам Рэмезаўскага і Ельскага ўчасткаў, старшым геолагам тэматычнай партыі Беларускай канторы разведачнага свідравання. У 1965 г. Уладзімір Антонавіч быў прызначаны галоўным геолагам, звязаўшы такім чынам сваё жыццё з пошукамі і разведкай нафтавых радовішчаў у Беларусі, а пазней – і Заходняй Сібіры. Пры яго асабістым удзеле былі разведаны і адкрыты першыя радовішчы нафты ў Прыпяцкім прагіне, якія паслужылі асновай для стварэння новай для краіны галіны – нафтаздабываючай. У 1969 г. У. А. Багіна быў пераведзены ва Упраўленне геалогіі БССР на пасаду начальніка геалагічнага аддзела па нафце, а затым галоўнага геолага па нафце і газу аб’яднання «Белгеалогія».

Уладзімір Антонавіч Багіна ўнёс значны ўклад ва ўдасканаленне методыкі пошукаў нафты ў складаных умовах Прыпяцкага прагіну. Асаблівую ўвагу геолаг надаваў навуковаму абгрунтаванню розных напрамкаў геолагаразведачных работ і ўкараненню навейшых дасягненняў навукі і тэхнікі.

Пад ягоным кіраўніцтвам геалагічнай службай краіны і пры непасрэдным удзеле адкрыты Рэчыцкае, Асташкавіцкае, Давыдаўскае, Вішанскае, Паўднёва-Сасноўскае і іншыя радовішчы нафты, якія забяспечваюць і да сённяшняга дня асноўную здабычу нафты ў Беларусі.

У Беларусі адкрыта каля 100 радовішчаў нафты, і выяўленню многіх з іх садзейнічаў працоўны ўклад геолага-нафтавіка У. А. Багіны.

У перыяд асваення нетраў Заходняй Сібіры Уладзімір Антонавіч прымаў непасрэдны ўдзел у абгрунтаванні геафізічных і буравых работ у раёне Красналенінскага зводу, у выніку чаго былі адкрыты Паўднёва-Талінскае, Антохскае, Туграўскае, Ловінскае і іншыя радовішчы нафты Заходняй Сібіры.

Шырокі дыяпазон яго навуковых інтарэсаў садзейнічаў апублікаванню ім больш як 60 навуковых прац, ён суаўтар 7 вынаходніцкіх прапаноў. У 1988 г. У. А. Багіна абараніў кандыдацкую на тэму «Структура нафтагазаносных комплексаў Прыпяцкага прагіну», па выніках якой яму была прысвоена ступень кандыдата геолага-мінералагічных навук.

Поспехі ў вытворчай і навуковай дзейнасці У. А. Багіна адзначаны граматамі Вярхоўнага Савета БССР, прэміямі Мінгеа СССР. Ён лаўрэат Дзяржаўнай прэміі БССР 1978 г. за ўклад у стварэнне Тэктанічнай карты Беларусі. За адкрыццё самага буйнога ў Беларусі Асташкавіцкага нафтавага радовішча ён узнагароджаны дыпломам і значком Мінгеа СССР «Першаадкрывальнік радовішча».

З 1998 г. Уладзімір Антонавіч працаваў у Беларускім навукова-даследчым геолагаразведачным інстытуце загадчыкам лабараторыі прагнозу нафтаноснасці. З 2008 г. Уладзімір Антонавіч знаходзіўся на пенсіі да сыходу ў іншы свет.

Вынікі працоўнай і навуковай дзейнасці У. А. Багіны будуць служыць базавай асновай для далейшага геалагічнага вывучэння нетраў Беларусі.

*Я. Г. Грыбік, Р. Г. Гарэцкі, А. А. Махнач, В. М. Бескапыльны, Б. Р. Кусаў, А. Ф. Нікуленка, А. Л. Сусленка, В. А. Карпаў*